*Занкевич В. А.*

# КІРЫЛА ТУРАЎСКІ – НАРАТАР, ПАЭТ І ФІЛОЛАГ-ЭКЗЭГЕТ

***Научный руководитель канд. филос. наук, доц. Савко Н. П.***
*Кафедра философии и политологии*
*Белорусский государственный медицинский университет, г. Минск*

Вывучаючы гісторыю сваёй Радзімы, я не раз пераконвалася , што многае ў ёй да нашага часу застаецца не вывучаным! На многія пытанні яшчэ пакуль нельга даць адназначны грунтоўны адказ. А колькі гістарычных асоб, аб якіх інфармацыя настолькі нязначная, што часам сённяшняму чалавеку складана вызначаецца. Для гістарычнай навукі характэрна наяўнасць шматлікіх, парой супярэчлівых поглядаў інтэрпрытацый адных і тых жа гістарычных падзей, гістарычных асоб і іх дзейнасць. Вывучэнне такіх супярэчлівых падзей і асоб сапраўдны прываблівае і захапляе.

Кірыла Тураўскі займае выключнае месца ў беларускай гісторыі. Манах-аскет, ахвярны пастыр, таленавіты пісменнік і прапаведнік, “другі Залатавусны”, як называлі Кірылу за красамоўства, стаўся адным з найбольш вядомых усходне-славянскіх духоўных дзеячаў XII стагоддзя. Кірыла Тураўскі быў адным з значных асоб свайго часу. З аднаго боку, з гэтых скупых звестак пра яго жыццё перад намі паўстае вобраз пакорлівага манаха. З іншага, мы бачым чалавека, які сваімі ведамі пераўзыходзіў многіх сваіх сучаснікаў. Ён быў бачным багасловам таго часу, калі багаслоўская думка ў Беларусі рабіла толькі першыя крокі. Слава Кірылы як духоўнага настаўніка разышлася ў Старажытнай Русі яшчэ ў гады яго жыцця.

Аддаючы даніну глыбокай павагі і пакланення перад сваціцелем, мы павінны прасякнуцца яго духоўным подзвігам, яго натхненню і жаданні працаваць у славу Божую, бяспрыкладнай любові да Выратавальніка і гатоўнасцю ахвяраваць сабой, каб несці людзям слова Госпада. Творчая спадчына Кірылы Тураўскага на рэдкасць багатая. Яна ўключае каля 70 твораў у сотнях спісаў і шматлікіх выданнях розных стагоддзяў. У жанравых адносінах тэксты Кірылы Тураўскага вельмі разнастайныя. Прасочваецца дасканалы аналіз твораў Кірылы Тураўскага. У сваёй рабоце я прааналізавала жыцце и творчую дзейнасць «Златавуста» , Які нарадзіўся ў Тураве.

Репозиторий БГМУ